Работніца і калгасніца Беларусі

№ 24
снежань
1935

Прамова таварыша СТАЛІНА

на нарадзе перадавых калгаснікаў і калгасніц Таджыкістана і Туркменістана 4 снежня 1935 г.

Таварышы! Прэзідыум данай нарады даручыў мне заявіць вам аб двух рэчах:

Па-першае, аб тым, што ў прэзідыума ёсць намер прадставіць к вышэйшай узнагародзе—к ордэну ўсіх ўдзельнікаў і ўдзельніц данай нарады—за выдатную работу. (Доўгія, бурныя апладысменты. Крыкі „ўра". Воклічы: „няхай жыве таварыш Сталін". Доўгая авацыя і прывітальныя воклічы па адрасу кіраўнікоў партыі і ўраду).



Па-другое, аб тым, што ў урада ёсць рашэнне даць па грузавіку кожнаму калгасу, прадстаўленаму тут, і паднесці кожнаму з удзельнікаў нарады па патэфону з пласцінкамі (апладысменты), і гадзіннікі: мужчынам—кішэнёвыя, а жанчынам — ручныя. (Доўгія апладысменты).

Мне гавораць адусюль, што я павінен сёе-тое сказаць.

Воклічы: Правільна (Апладысменты).

Што тут сказаць? Усё сказана.

Відавочна, што справа з бавоўнай у вас пойдзе. Гэта відаць з усяго таго, што ў нас тут адбываецца. Калгасы ў вас растуць, жаданне працаваць ёсць, машыны дамо, угнаенне атрымаеце, дапамога ўсякая, якая толькі неабходна,—таварыш Молатаў, старшыня соўнаркома, ужо заявіў Вам аб гэтым,—будзе аказана. Значыць, справа з бавоўнай у вас пойдзе, і заможнае жыццё разгортваецца.

Але ёсць, таварышы, адна рэч, больш каштоўная, чым бавоўна—гэта дружба народаў нашай краіны. Даная нарада, вашы прамовы, вашы справы гавораць аб тым, што дружба паміж народамі нашай вялікай краіны ўмацоўваецца. Гэта вельмі важна і знамянальна, таварышы. У стары час, калі ва ўладзе ў нашай краін сталі цар, капіталісты, памешчыкі, палітыка ўрада заключалася ў тым, каб забіць адзін народ—рускі народ—пануюым, а ўсе іншыя народы—падначаленымі прыгнечанымі. Гэта была зверская, воўчя палітыка. У катрычніку 1917 год, калі ў нас разгарылася Вялікая пролетарская рэволюцыя, калі мы скінулі цара, памешчыкаў і капіталістаў, вялікі Ленін, наш настаўнік, наш бацька і выхавацель сказаў, што не павінна быць з гэтага часу ні пануючых, ні падначаленых народаў, што народы павінны быць роўнымі і свабоднымі. Гэтым ён пакаваў у труну старую царскую, буржуазную палітыку і агаласіў новую, большэвіцкую палітыку — палітыку дружбы, палітыку брацтва паміж народамі нашай краіны.

З таго часу прайшло 18 гадоў. І вось, мы маем ужо добрыя рэзультаты гэтай палітыкі. Даная нарада з'яўляецца яркім доказам таго, што былому недавер'ю паміж народамі СССР даўно пакладзен ужо канец, што недавер'е змянілася поўным ўзаемным давер'ем, што дружба паміж народамі СССР расце і мацнее. Гэта, таварышы, самае каштоўнае з таго, што дала нам большэвіцкая, нацыянальна палітыка.

А дружба паміж народамі СССР—вялікае і сур'ёзнае заваяванне. Бо пакуль гэта дружба існуе, народы нашай краіны будуць свабодны і непераможны; ніхто не страшны нам, ні ўнутраныя, ні знешнія ворагі, пакуль гэта дружба жыве і здравствуе. Можаце не сумнявацца ў гэтым, таварышы. (Бурная авацыя, усе прысутныя ўстаюць, воклічы „Сталіну ура!").

Инв. № 111

Прыём стаханаўцаў ільнаводства членамі ЦК КП(б)Б і ўрада БССР

17 снежня, у зале пасяджэння СНК БССР адбыўся прыём стаханаўцаў ільнаводства членамі ЦК КП(б)Б і ўрада БССР. На прыёме прысутнічалі таварышы **Гікало, Галадзед, Чарвякоў, Валковіч, Картукоў, Бенек, Леплеўскі, Стэрнін, Гваздзецкі, Гурэвіч, Цімашэнка, Амбражунас, Ляўкоў, Аўгустайціс, Кудзелька, Чарнушэвіч, Дзякаў, Валодзька**, калгасніцы і калгаснікі—стаханаўцы ільнаводства, выпрацаваўшыя ў дзень ад 30 да 73 кілограмаў высокаякаснага валакна. т. т. Рагоўская, Быкоўская, Гаваркова, Дзяжурная, Лысоў, Пецкалёва, Якубенка, Кавалёва, Кірмашук, Немкова, Марцынкевіч, Пярцова П., Гайдукова, Архіпава, Долгая М. А., Долгая М. Н., Анікеева, Ерамей, Канькова, Шрабянок В., Шрабянок Х., Пярцова М., Салаўёва, Сматрыцкая, Менькова, Далганава, Іспраўнікава, Березовік, Мяхедава Е., Максімова, Цыркунова, Сумнікава, Мяхедава А., Мацкевіч, Каньчанкова, Кругліцкая, Зубец, Міхалёнак, Крукава і Шаўцова.

Аб героіцы калгаснай працы, радасці і шчаслівым жыцці ў калгасах, аб гарачай любві да камуністычнай партыі і бязмернай адданасці сваёй соцыялістычнай радзіме, аб вялікай удзячнасці найшырэйшых калгасных мас да любімага друга, настаўніка і правадыра таварыша **Сталіна** гаварылі перадавыя калгасніцы, якія адна за другой выступалі, каб падзяліцца думкамі з кіраўнікамі КП(б)Б і ўрада БССР.

Першай выступіла ініцыятар стаханаўскага руху па апрацоўцы ільну т. **Сцепаніда Сільвестраўна Быкоўская.** Яна гаварыла аб вялікай сіле камуністычнай партыі, што ўзброіла стаханаўскімі метадамі работы дзесяткі, сотні калгасніц і калгаснікаў БССР, якія ўслед за Быкоўскай пачалі выпрацоўваць не толькі па 24 кілограма валакна ў дзень, але і па 60, па 70 і больш.

— Тады, як таварыш **Гікало** пахваліў мяне з трыбуны ўсебеларускага злёта майстроў ільну за стаханаўскую работу, я ўсё яшчэ сабе не ўяўляла, што пачнуць і іншыя калгасніцы працаваць, як я. А сёння, глянь, як яно разраслося...

Аб вялікай радасці гаворыць т. Быкоўская і прысутныя ёй горача апладыруюць, калі яна расказвае, што Райвыканком узнагарадзіў яе новым прасторным домам за ўзорную большэвіцкую работу.

— А на будучы год лепш, яшчэ лепш працаваць будзем і пяць цэнтнераў валакна з гектара возьмем,—адказвае Быкоўская на запытанне таварыша Гікало, ці чытала яна прамову **Сталіна** на прыёме камбайнераў.

Гікало:—вось і выходзіць, што трэба абавязкова дабіцца, каб нам у БССР за два—тры гады ўзяць не менш пяці цэнтнераў валакна з гектара.

Быкоўская:—так я і кажу, што мы ў сваім калгасе гэтага дабʻемся і абавязкова іншыя калгасы сваім прыкладам за сабой пацягнем.

Лён—справа не толькі калгасніц. Лён—справа ўсей партыі, усей краіны, кожнага калгаса ў цэлым. І аб гэтым з усей любоўю гаварыў т. **Фёдар Лысоў** з Віцебшчыны, які ўстанавіў усебеларускі рэкорд ручнога трапання.

Шчасце і рост добрабыту сваёй горача любімай радзімы—вышэйшая радасць совецкага грамадзяніна, патрыёта сваёй квітнеючай у пафосе асваення вышэйшай тэхнікі совецкай краіны.

Гэтай думкай прасякнута выступленне не адаго толькі Фёдара Лысова. Аб гэтым самым гаварыла **Праскоўя Нікалаеўна Пярцова, Аўдоцця Цярэнцяўна Кавалёва** і іншыя калгасніцы, выказаўшыя ў сваіх прамовах увесь гонар беларускага народу, радасць і шчасце Беларусі—у мінулым лапцюжнай, забітай, якая цяпер пад чырвоным совецкім сцягам, пад кіраўніцтвам партыі **Леніна—Сталіна**, у вялікай дружбе народаў стала рэспублікай фабрык і заводаў, калгасаў і соўгасаў, рэспублікай высокай культуры і высокапрадукцыйнай соцыялістычнай працы.

Услед за Кавалёвай, прадстаўніцай старэйшага пакалення калгасніц, выступае маладзенькая **Арыся Цыркунова.** Яна ў чатыры разы маладзей Кавалёвай. Радзілася яна толькі ў 1920 г. Але гаворыць Арыся Цыркунова аб тым-жа самым і думае яна тую-ж думку, што і старая Кавалёва: як-бы павялічыць сілу краіны, як-бы павысіць дабрабыт народу, як-бы зрабіць жыццё радасным і шчаслівым для ўсіх!

Такая яна, наша моладзь, наша шчаслівая моладзь, не ведаючая пана і кулака, галечы і жабрацтва.

І каму, як не сваёй комуністычнай партыі, свайму рабоча-сялянскаму ўраду расказаць, што праца ў нашай краіне са справы ганебнай і праклятай ператварылася ў справу гонару і славы. Вось чаму не сядзіцца на сваім месцы і **Крукавай** з Сіроціншчыны, і **Максімавай** і **Шаўцовай**, кожнай хочацца аб сваёй радасці хоць што-небудзь сказаць і сваю думку яны выказваюць у двух славах, якія гучаць, як лозунг, як песня, як верш паэта:

— Геройства працы! Ацанілі нашу працу!

Уважліва выслухоўваюць прысутныя выступленне тав. **Галадзеда**, які гаворыць аб задачах па павышэнню ўраджайнасці, пастаўленых перад БССР Цэнтральным камітэтам ВКП(б).

Гарачай авацыяй, радаснымі воклічамі „ура" сустракаюць лепшыя стаханаўцы ільнаводства таварыша **Гікало**, прамова якога некалькі разоў прарываецца бурнымі воплескамі.

Сцяг спаборніцтва за стаханаўскія метады на ільне, за высокую норму выпрацоўкі першыя ўзнялі жанчыны. Яны ўвесь час ідуць у першых радах удзельнікаў паходу імя таварыша **Гікало** за лён.

І гарачай авацыяй любімаму кіраўніку большэвікоў ордэнаноснай БССР яны дэманстравалі сваю гатоўнасць у надыходзячым годзе дабіцца яшчэ большых поспехаў і сваёй працай зрабіць беларускі лён гордасцю беларускага народа.

Горача вітаў стаханаўцаў ільнаводства таварыш **Чарвякоў**—якога ўсе удзельнікі прыёму сустрэлі бурнай авацыяй.

Адна за другой падыходзілі да стала прэзідыума гераіні калгаснай працы і, горача паціскаючы рукі т. т. Чарвякову, Гікало, Галадзеду, атрымлівалі ад старшыні ЦВК СССР і БССР тав. Чарвякова ганаровыя граматы і падарункі ЦВК і СНК БССР.

Усе ўдзельнікі прыёму ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі (патэфонамі, швейнымі машынамі, гадзіннікамі). На падарунках—іменная манаграма з надпісам **„Стаханаўцы—ільнотратрапальшчыцы ад урада БССР 17|XII 1935 г."**

НОВЫ ЧАЛАВЕК

Было гэта на ўсебеларускім злёце майстроў ільну. На трыбуну расквітнеўшай у чырвані вялікай залы з'ездаў Дома Ўрада лёгкай хадой увайшла сухарлявая з бліскучымі, як агеньчык вачыма старая. Мяккім, як шоўк і гучным, як метал голасам яна пачала гаварыць аб ільне, аб валакністым і залацістым, што яна і яе сяброўкі працуюць над тым, каб совецкі лён быў самым лепшым у свеце і што яны безумоўна, гэтага дамагуцца. І была ў яе словах такая жалезная ўпэўненасць, яна гаварыла так захапляюча і палка, што цяжка было не верыць, што так яно сапраўды будзе.

— Хто яна такая?—запыталі мы суседа, не спускаючы вачэй з гэтай чароўнай жанчыны, бабулі па гадах, і маладой па імпэту і энергіі.

— Кавалёва, Аўдоцця Цярэнцьеўна — спяшаючыся адказаў сусед. Відаць і яму не хацелася прапусціць ні аднаго слова гэтага палкага прамоўцы. Крыху пачакаўшы, ён дадаў:—Кавалёва, член ЦВК БССР, калгасніца з Лёзняншчыны...

А Кавалёва тым часам спакойна разматвала з вялікай трыбуны клубок сваіх думак. Яна гаварыла аб машыне, якая павінна аблегчыць жаночую працу, гаварыла аб 26 нумары валакна Шклоўскага вопытнага ільнозавода, які ўзоры сваёй прадукцыі выставіў у фае. Яна гаварыла пра 19 нумар валакна Шклоўскага калгаса „Правда". Не лён, а шоўк, які быццам чыясьці срэбрыста-залацістая, клапатліва дагледжаная каса рассыпалася па руцэ доўгімі мяккімі прадзямі.

— Эх! Такі лён, ды каб усюды!

І сама ўпэўнена сабе адказала:

— Будзе!

* * *

Лёзняншчына была ў глыбокім прарыве. План здачы ільновалакна выконваўся надзвычай марудна. Былі ў некаторых калгасах ільнотрапальныя машыны, але яны больш прастойвалі, чым працавалі.

У прарыве быў і калгас „Беларуская вёска", членам якога з'яўляецца Аўдоцця Цярэнцьеўна. Не спорылася ў калгасе работа з апрацоўкай ільну. Тады яна ўзняла перад праўленнем пытанне, каб закупіць ільнотрапальную машыну Гарлачова.

Аўдоцця Цярэнцьеўна на фабрыцы ніколі не была. Упершыню яна ўбачыла ільнотрапальную машыну на менскай машына-даследчай станцыі. І яна ёю захапілася. Яна ўбачыла сродак для аблягчэння працы жанчыны. Яна ўбачыла ў машыне сродак для хутчэйшага выканання плана. І яна скарыстала ўвесь свой аўтарытэт члена ўрада, каб прымусіць старшыню калгаса т. Менжынскага безадкладна купіць машыну.

Гэта была ўрачыстасць, перамога Аўдоцці Цярэнцьеўны.

Прыйшла машына. Такія-ж машыны стаяць і ў іншых калгасах раёна. Але як пусціць яе ў ход, як прымусіць іх даваць шаўкавісты лён?

Кавалёва ўзялася вывучаць машыну. Кожны шрубочак, кожную часцінку яна дакладна разбірала і вывучала. Прыглядалася да ходу коней, каб прывод даваў абаротаў не больш і не менш, чым трэба для бесперабойнай работы, каб машына ўвесь час ішла з аднолькавай нагрузкай.

І Кавалёва пусціла машыну ў ход.

Так 56-гадовая Аўдоцця Цярэнцьеўна стала палкім агітатарам за механізаваную працу.

* * *

Другое наша спатканне з Аўдоцяй Цярэнцьеўнай было даволі нечаканым.

Было гэта так. У поўдзень прыехалі ў калгас „Беларуская вёска". Пытаемся, дзе нам знайсці Аўдоццю Цярэнцьеўну? У калгасе нам параілі шукаць яе або ў калгасе „Заветы Леніна" Веляшкоўскага сельсовета, або ў адным з калгасаў Крынкаўскага сельсовета.

— Як знайшла наша бабуля свой метад работы на ільнотрапальнай машыне, яна супакою не ведае,—адказалі нам калгаснікі. Не бывае таго дня, каб з якога-небудзь калгаса да яе не прыехалі прасіць наладзіць работу машыны. Так яна наладзіла работу машыны Гарлачова ў калгасах імя Карла Маркса і „Новае жыццё", Крынкаўскага сельсовета, „X з'езд советаў", „Заветы Леніна" і „Калектыўная праца", Веляшкоўскага сельсовета. Цяцер яна працуе інструктарам раённага аддзялення „Заготлён".

Позна ўвечары знайшлі мы яе на таку калгаса „X З'езд Советаў".

— Бачыце, каб часу не траціць на пераноску і адрэгуляванне машыны, мы з калгаснікамі рашылі мятую трасту з суседніх калгасаў перавезці сюды, каб тут ужо трапаць,—тлумачыць Аўдоцця Цярэнцьеўна. А каб крыўды не было мы падзялілі Гарлачоўку на дзве часткі—на адной трэплюць калгасніцы з арцелі „Заветы Леніна", а на другой з „Калектыўнай працы". Сварак паміж імі няма, маіх указанняў слухаюцца, а гэта, як вядома, лепшая зарука паспяховай працы.

Ток калгаса „X з'езд Советаў" сёння больш нагадвае сабой майстэрню, чым калгасны свіран, на якім кожны робіць, што яму ўздумаецца. Работа тут арганізавана канвеерам, дзе які вінцік спыніцца, або выпадзе, гэта адразу адаб'ецца на рабоце ўсяго ланцуга.

Праца на таку падзелена на тры часткі—абцяжка жмені, непасрэднае трапанне на машыне і датропка, гэта значыць канчатковая ачыстка валакна набела. Адпаведна гэтаму на таку вызначаны тры кваліфікацыі—абцяжчык, машыністка і датропшчыца.

На абцяжку, звычайна, ставіцца мужчына. У яго функцыі ўваходзіць падрыхтаваць з груды намятай трасты жменькі. Ён іх расцягвае, выраўноўвае і кладзе ці вешае на лаўку з правай рукі трапальшчыцы, каб, павярнуўшыся ўправа, яна б адразу магла ўзяць падрыхтаваную жменю і класці ў машыну. На чацвёра машыністак вызначаецца адзін абцяжчык, які з поспехам спраўляецца з падрыхтоўкай для іх расцягнутай трасты.

Пры такой сістэме галоўная ўвага накіравана на тое, каб трапальшчыца ва ўвесь час свайго рабочага дня нікуды не павінна была адлучацца, каб увесь яе час быў заняты выключна на трапанні.

Каб атрымаць валакно ў канчаткова апрацаваным чыстым выглядзе, трэба было-б часта мя-

няць тэмп машыны. А гэта менш за ўсё пажадана. З гэтай мэтай, каб атрымаць чыстае валакно на кожную пару машыністак даецца адна датропшчыца, якая канчаткова датропвае валакно.

Прадукцыйнасць працы вылічваецца на тройку—дзве машыністкі і адна датропшчыца.

— Што-ж галоўнае ў вашым метадзе? — пытаемся Аўдоццю Цярэнцьяўну. Нас у калгасах раёна завуць стаханаўкамі,—адказвае т. Кавалёва, гэта таму, што галоўнае ў нас—правільная арганізацыя працы, строгае размеркаванне па працэсах і роўнамерная нагрузка ўсяго рабочага дня. Тут і перабояў няма і лодыраў не будзе. Варта каму загультаіць, як гэта адразу становіцца відна. Вось так, як на сапраўднай фабрыцы ў горадзе.

Пра сваю работу Аўдоцця Цярэнцьеўна гаворыць з захапленнем юнака. Лічыцца, што Гарлачоўка дае менш двух цэнтнераў валакна ў дзень. Аўдоцця Цярэнцьеўна спачатку выпрацоўвала два цэнтнера, а потым 2,5 цэнтнера, і 2,66 цэнтнера.

З пачуццём асаблівай радасці расказвае т. Кавалёва пра сваю работу ў калгасе „Новае жыццё", Крынкаўскага сельсовета.

Тут ёй удалося поўнасцю механізаваць усю працу на ільне. У калгасе паставілі нафтавы рухавік, які црыводзіць у рух шасціпарвальную мялку, гарлачоўку і бяльгійскае калясо. Чатыры дні яна папрацавала ў гэтым калгасе, але дабілася таго, што ўся работа, пачынаючы ад мяцця і канчаючы датропкай робіцца машынамі. Гэта вялікая рэволюцыя ў калгаснай вытворчасці, з корнем перарабляючая ўсю псіхалогію вясковага чалавека, выкарчоўваючы рэшткі ідыётызма вясковага жыцця, зроблена па ініцыятыве жанчыны-калгасніцы, якая толькі ў новым соцыялістычным грамадстве атрымала права звацца чалавекам.

Радзіма можа ганарыцца сваёй дзівоснай дачкой, якая так ганарыцца сваёй радзімай!

Мы былі вымушаны пакінуць гэту дзівосную бабулю, якую патрабавалі неадкладныя справы ля машыны, на таку, дзе пад яе кіраўніцтвам працавала 20 чалавек.

На заўтра раніцою Аўдоцця Цярэнцьеўна паспяшыла паведаміць нам, што за мінулы дзень на машыне было выпрацавана 2,64 цэнт. валакна. Яшчэ раз апракінуты ўсякія ўяўленні аб нормах, аб нізкай прадукцыйнасці машын. Гэта абвяргае практыка людзей, аўладаўшых тэхнікай, практыка людзей, працуючых па метаду тав. Кавалёвай.

* * *

Гэтымі днямі атрымалі мы ліст ад Аўдоцці Цярэнцьеўны. Тропка ільну ў калгасах закончана. Але неўгамонная бабуля не супакойваецца. Усю сваю энергію яна зараз накіроўвае на арганізацыю калгаснікаў, каб адказаць таварышу Сталіну на яго прамову пры прыёме камбайнераў і камбайнерак яшчэ большым павелічэннем ураджайнасці ільну. Кавалёва ўжо зараз мае дакладны план барацьбы за высокі ўраджай.

Гэта па-першае, агранамічная вучоба. Яна пераканалася, што калгасніку трэба ведаць, якое мінеральнае ўгнаенне даваць пад лён, пра глыбіню ворыва і пра папярэднікаў. Вось яна і дагаварылася, каб у калгасе арганізаваць гурток для ўсіх калгаснікаў і калгасніц.

Насеннем на будучы год калгас забяспечан. Цяпер уся справа ў тым, каб трымаць насенне ў парадку, каб яно было чыстае, сухое, каб не страціла яно ўсхожасці. Насенне адсартавалі. Свіран прачышчан. Закупілі і прывезлі ўгнаенне, пачалі попел збіраць. Сваё пісьмо Аўдоцця Цярэнцьеўна заканчвае ўпэўненасцю, што 5 цэнтнераў валакна з гектара яны на будучы год у калгасе возьмуць.

Мы ў гэтым не сумняваемся.

Аўдоцця Цярэнцьеўна паказала ўжо, што па-большэвіцкі працаваць яна ўмее, што яна гаспадар свайго слова.

Л. Каплан.

Прэзідыум злёта лепшых ільнотрапальшчыц Лёзняншчыны сумесна з дэлегацыяй Суражскага раёна. Другая злева т. Ковалёва.

На шыроказахватнай

На звонкае поле вышла шыроказахватная „ВНІЛ-5“. На ёй працавала маладая церабільшчыца Домна са сваім сябром Алесем. Як толькі ўзыйдзе сонца і высахне раса, церабілка стракоча ў бязмежным ільняным полі. У маладых і моцных руках яна працуе чотка і беззаганна.

Каля машыны ўвесь час ходзіць Домна, або Алесь. Праз кожныя дзве гадзіны яны змазваюць кожны вінцік. Часткі машыны працуюць дакладна, як гадзіннік. Яны аглядаюць іх праз кожныя поўгадзіны.

У першыя дні крыху забіваліся секцыі ільноцерабілкі. Алесь узяўся адрэгуляваць рамні. Ён пусціў іх роўна і секцыі не забіваліся.

А вельмі часта бывае, што з-за гэтых рамнёў машына ў другіх церабільшчыкаў прастайвае дарагі час. Яны ўсё скардзяцца на дрэннае надвор'е, сыры лён, які засмечвае секцыю.

— Справа не ў пагодзе,—гаворыць тады Домна.—Вінавата не машына, а людзі. Трэба правільна ўстанавіць машыну і яна пойдзе складна.

Шмат ёсць „сакрэтнага“ ўнутры машыны. Яе трэба добра вывучыць, адкрыць „сакрэты“. Вось узяць хоць бы той вінцік, што ў церабільных роліках. Калі яго часта не заліваць, ён загарыцца і ролікі прыдуць у нягоднасць. Домна і Алесь спаборнічалі з церабільшчыкамі Белкіным і Мачульскім. У спаборніцтве яны вышлі пераможцамі. Тыя ледзь выканалі норму, выцерабіўшы за сезон 50 гектараў. А церабілка Домны **Каравосавай** і Алеся **Шустава** дала за сезон 86 гектараў.

Каравосава Домна.

Слава аб церабільшчыках-стаханаўцах абышла ўвесь раён. Калгаснікі прыходзілі паглядзець на работу машыны. Яны хвалілі, што церабілка не блытае ільну, выбірае яго чыста. Маладыя хлопцы і дзяўчаты частавалі Домну і Алеся ягадамі. Домна сыпала ягады на прыпол і ўсміхалася сонцу і людзям.

* * *

Так нарадзілася сяброўства.

Раней Домна не ведала Алеся. Жыла сіратою. Тры сястры не мелі шчасця, не мелі сяброўства. А прышлі ў калгас і знайшлі шчасце. Старэйшыя сёстры выйшлі замуж. Домна ўступіла ў комсамол. Першы яе сябр—комсамолец Алесь Шустаў, з якім яна разам працуе на ільноцерабілцы.

У сваім калгасе „Ленінскі шлях“, Макараўскага сельсовета, лепшымі яе сяброўкамі лічацца адказная па ільну—комсамолка Каця **Самусёва**, трапальшчыцы—комсамолкі Акуліна **Сакунова** і Вася **Новікава**. Яны падружыліся на калгаснай рабоце. Разам хадзілі трапаць лён, а вясной ездзілі на поле араць і баранаваць. У калгасе Домна выпрацавала 206 працадзён. Гэта акрамя работы на ільноцерабілцы.

Цяпер многа маладых калгаснікаў і калгасніц хочуць быць такімі, як Домна Каравосава. Яны таксама будуць працаваць на шыроказахватнай „ВНІЛ 5“. Домна абавязалася ў 1936 годзе даць не менш 100 гектараў на сваёй ільноцерабілцы.

Гэта заклік да ўсіх маладых церабільшчыкаў.

Ан. Лясны.

Горацкі раён.

Звяно Канчанковай

Моцна палюбіла лён **Канчанкова** Прасіння. Яшчэ з пачатку вясны яна гаварыла на агульным сходзе калгаса:

— Трэба лянком засяваць лепшую глебу з лепшымі папярэднікамі, тады і лён вырасце вялікі і валакно будзе добрае.

Усю ўвагу ільну аддавала Прасіння ў час яго праполкі і церабления. Працуючы звеннявой паказвала лепшыя прыклады работы. У паходзе за лён імя тав. Гікало дамагалася зрабіць гэту тэхнічную культуру лепшай у свеце.

Што казаць, добры атрымалі ўраджай ільну,—казалі калгаснікі, прыступаючы да яго апрацоўкі. Канчаткова не памылілася, калі гаварыла аб такім ільну вясной.

Разгаралася ўдарная работа на мяльна-трапальным пункце. Добра адлежаная, прасушаная і змятая ільнотраста заахвочвала да працы трапальшчыц. Але больш іх была задаволена работай звеннявая Канчанкова. На апрацоўцы ільну, даючы вялікую выпрацоўку, яна не адчувала ніякай стомленасці.

— Трэба палюбіць сваю работу,—кажа Прасіння,—уважліва адносіцца да справы, тады будзе і поспех. Маё звяно, якое складаецца з пяці трапальшчыц заўсёды разам выходзіла на тропку, у адзін час рабілі перапынак, але вынікі работы атрымоўваліся розныя. Пяршынство безумоўна было за мной. Штодзённа я натропвала 15—16 кгр., № 14—16, ці 210—256 кілонумароў.

Трапала ў мяне зроблена з кляновага дрэва, таму яно лёгкае, добра адшліфаванае, не стамляе руку і не блытае валакно. А галоўнае ў тропцы—гэта злёгку біць траплом уздоўж жмені, часцей варушыць валакно і вытрасаць кастрыцу.

Ударная работа трапальшчыцы Канчанковай і яе сяброўак **Сакаловай** Ульяны, **Сапежынскай** Ганны, **Канчанковай** Каці і **Паўс** Лёксы забяспечыла калгасу поспех. Да 25 верасня калгас выканаў ільнозагатоўкі, здаўшы валакно не ніжэй 13 нумара. Лепшая трапальшчыца Канчанкова Прасіння заслужыла права быць удзельніцай усебеларускага злёта знатных людзей ільну. Звярнуўшыся са злёту яна ўзначальвала буксірную брыгаду па тропцы ільну ў суседнім калгасе Машчоны.

Калымага.

Сенненскі раён, калгас „Канец“.

Стаханаўкі ільнаводства

Позняй ноччу 27 лістапада прыехалі ў калгас „Зара Запада" стаханаўкі - трапальшчыцы **Быкоўская** Сцепаніда і **Папова** Наста для перадачы свайго вопыта і метадаў работы калгасніцам-ільнотрапальшчыцам.

Работа пачалася з 10 гадзін раніцы. Месцам для апрацоўкі ільну абралі павець калгасніка. Тут-жа пачалі працаваць і калгасніцы **Шэверкова** Ганна і **Мамонава** Фёкла Сямёнаўна. Падсобную работу, як абцяжка і раўнанне жмень, выконвалі калгасніцы **Дзянісава** Сафея і **Амбразевіч** Тамара.

Прывезлі лён. Але ў калгасе неахайна да яго адносяцца. Ён недобраякасна змят, паблытан. Ніяк не адрозніць, дзе камель, а дзе верхавінне.

Вельмі цяжка паддаецца апрацоўцы гэты лён, б'ем, а кастра і не адстае—гаворыць Сцепаніда Сільвестраўна Быкоўская.

У першы дзень працавалі 9 гадзін. Быкоўская Сцепаніда натрапала 16,4 кілограма, Папова Наста—14,4 кіло, Мамонава Фёкла Сямёнаўна — 13,2 і Шэверкова Ганна—8 кілограм.

* * *

Павольна надыходзіць марозная, лістападаўская раніца. Да відна заставалася каля двух гадзін. Першымі на трапальны пункт прыходзяць Быкоўская і Папова. Ім прышлося перш падрыхтаваць некалькі жмень ільну і самім-жа потым трапаць.

Праз гадзіну на пункт прышлі астатнія трапальшчыцы. Яны прагна прыглядаліся да кожнага руху прыёмаў Быкоўскай і Паповай і стараліся тут-жа прымяніць у сваёй рабоце.

Бяручы жменю трапальшчыцы адразу-ж пачыналі падтрасаць яе без удара траплом, кастра высыпалася з валакна. Пасля абцяжкі пачыналі ўжо трапаць. Хутка ходзяць рукі трапальшчыц. Два—тры ўдара, пераварочванне, зноў удары, падтрасанне і камель жмені гатоў.

Такімі-ж прыёмамі апрацоўваецца і верхавіна. Наогул, жмеля больш вытрасаецца, чым б'ецца траплом. Гэта галоўнае ў рабоце Быкоўскай і Паповай. Нельга лішняга разу біць траплом па валакну, бо гэта прывядзіць да вялікіх страт.

Навучыліся трапальшчыцы і трымаць трапло. Зараз ніхто ўжо не б'е ўздоўж жмені, аж пускаюць трапло наўскасяк. У час трапання робіцца сцягванне жмені. Калі не прытрымлівацца гэтага правіла валакно псуецца, зніжаецца яго нумарнасць. Другі дзень работы прынёс вялікую перамогу. За змену Папова Наста натрапала 34 кілограма, Быкоўская Сцепаніда—28 кілограм (Быкоўская крыху была захварэла), Мамонава Фёкла Сяменаўна—22 кгр. і Шэверкова Ганна—20 кгр. валакна.

Да прыезда Быкоўскай і Паповай у калгасе выпрацоўвалі не больш паўцэнтнера валакна ў дзень, а ў гэтыя дні давалі па паўтара цэнтнера.

* * *

З ранку 30-га лістапада адбылася нарада калгаснага актыва, старшынь калгасаў і лепшых трапальшчыц сельсовета, з удзелам стаханавак ільнаводства—Быкоўскай, Паповай, Пярцовай, Сумнікавай і сакратара раённага камітэта партыі таварыша Дзеніскевіча.

На нарадзе тав. Дзеніскевіч зрабіў даклад аб прамове таварыша Сталіна на першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў прамысловасці і транспарта. Застанавіўся ён на становішчы сельсовета і заклікаў калгаснікаў хутчэй канчаць ільнозагатоўкі, разгортваць стаханаўскі рух ва ўсіх галінах гаспадаркі.

Выступіўшая Мамонава Фёкла заявіла:

— Да гэтага часу аб працы стаханаўцаў я толькі чытала ў газетах і сумнявалася, што сапраўды магчыма столькі выпрацаваць. Зараз я ўпэўнілася, што можна. Я не толькі пераняла метады працы Быкоўскай і Паповай, а пастараюся дасягнуць іх выпрацоўкі.

— Я ўпэўнена, што кабыльніцкія трапальшчыцы будуць такімі-ж стаханаўкамі ільнаводства, як і я—заявіла ў сваім выступленні Сцепаніда Сільвестраўна Быкоўская.

Лёзненскі раён. **Міхась Шуранкоў.**

„ЖАНОЧЫ" СЕЛЬСОВЕТ

З недавер'ем аднесліся некаторыя калгаснікі і раённыя кіраўнікі, калі старшынёй сельсовета абралі Дуню **Пашугіну.**

— Не справіцца Дуня!—казалі яны.

Ды і сама Дуня не была ўпэўнена ў сваіх сілах.

Прыехаўшы ў сельсовет, яна адразу згрупавала вакол сябе моцны сельсовецкі актыў. Праз некаторы час сельсовет пачаў паспяхова выконваць усе дзяржаўныя заданні.

У раённай зводцы, насупраць Мала-Сітнянскага сельсовета, дзе працуе старшынёй Дуня, заўсёды стаіць круглая лічба 100 проц.

Дуню рэдка калі знойдзеш у сельсавеце, яна або каля жанчын, якія трэплюць лён, каля будаўніцтва, або на полі.

Радасна стукала сэрца, калі раённая конкурсная камісія прысудзіла Мала-Сытнянскаму сельсовету пераходны сцяг прэзідыума раённага выканаўчага камітэта.

Не адстае сельсовет і па мабілізацыі сродкаў. Зараз ідзе змаганне за пераходны сцяг, які трымае перадавы Сосніцкі сельсовет, старшынёй якога з'яўляецца член ЦВК БССР **Сабаленка** Алена.

На злёце фінударнікаў сельсовета Пашугіна заявіла:

— Сцяг павінен быць нашым! План IV квартала будзе выканан сельсоветам.—

У раёне Мала-Сітнянскі сельсовет лічаць „жаночым". І гэта не дзіўна. Старшынёй там працуе жанчына, сакратаром і рахункаводам таксама жанчыны. За сваю добрую работу Пашугіну некалькі разоў прэміравалі.

Полацкі раён. **М. Грыгор'еў.**

МАЕ КАРОВЫ ДАДУЦЬ У 1936 ГОДЗЕ ПА 3000 ЛІТРАЎ МАЛАКА

Пі сьмо даяркі калгаса „Чырвоны фронт", Магілёўскага раёна, Ксені Міхайлаўны Кунасавай сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО)

Дарагі Нікалай Фёдаравіч!

Куды ні зірнеш, з якога боку не паглядзіш на наша калгаснае жыццё, усюды бачыш сцвярджэнне мудрых сталінскіх слоў: „Жыць стала лепш, жыць стала весялей. А калі весела жывецца, работа спорыцца". Праўда, калі мы жыць сталі лепш, калі хлеба і к хлебу пачала даставаць, зусім па-іншаму пашла ў нас работа. Зямля пачала даваць большыя ўраджаі, а каровы больш малака.

Я даярка. Працую на малочна-таварнай ферме ўсяго 10 месяцаў. Але я і раней ведала, як працавала ферма. 1200—1500 літраў малака ў год давалі каровы—не больш. Чаму так? Мо' каровы дрэнныя? Не, каровы ў нас добрыя, буйныя, у большасці метысы швіцкай, або мясцовай палепшанай пароды. Але ўся справа ў тым, што догляд за імі быў нікудышні і праўленне не клапацілася аб кармах. „Карове апроч саломы і вады нічога не трэба",— гаварылі праўленцы.

Гэты год мы працавалі інакш. Даглядалі кароў, так як патрабуе зоатэхніка. Кармілі і паілі ў строга ўстаноўлены час. Кожны дзень падсцілалі жывёле свежую салому, чысцілі шчоткай і скрэбніцай.

Бераглі кароў зімою ад холаду, а летам ад аваднёў і мух. І хоць праўленне і ў 1934—35 годзе не здолела забяспечыць жывёлу кармамі (зімою каровы жылі на адной саломе, а летам на пасбішчы) усё-ж уважлівым доглядам мы дабіліся павышэння іх прадукцыйнасці. Мы атрымалі за год у сярэднім па 1700 літраў малака ад каровы. А нашы лепшыя каровы далі за год па 2200—2600 літраў.

Аднак і 1700 літраў на карову зусім мізэрная лічба. Мы ведаем, што ёсць не мала кароў, якія даюць па 5—8—10 тысяч літраў малака ў год і больш. Марыя **Дземчанка** і ўсе пяцісотніцы Украіны атрымалі са звычайнага поля ўраджай у чатыры разы больш сярэдняга. А чаму мы не можам ад сваіх кароў атрымаць больш малака? Марыя Дземчанка і яе таварышкі добра працавалі на полі, бераглі кожны бурак. Мы можам таксама працаваць на ферме. Апроч таго гэты год мы забяспечылі жывёлу кармамі лепш як у папярэднія гады. Сёлета наша жывёла атрымлівае не толькі салому, як гэта было мінулыя гады, а па 4 кгр. сена, 10 кгр. кораньплодаў, 8 кгр. сілосу, 0,2 кгр. канцэнтратаў кожны дзень. К будучаму году засеяна 30 га канюшыны. Мы падлічылі, што калі ўвесь гэты корм выкарыстаем, як належыць, нашы каровы змогуць даць у 1936 годзе 3000 літраў малака. Гэта амаль удвая больш сёлетняга ўдоя.

Тав. Кунасава.

Гэту лічбу я сама абмеркавала з усіх бакоў. Правільна, можам атрымаць такі ўдой у наступным годзе. Тады я расказала праўленню і калгаснікам, што ў 1936 годзе буду змагацца на ферме, як Марыя Дземчанка на полі, за 3000 літраў малака. Праўленне і калгаснікі падтрымалі мяне. Гэта надало яшчэ больш упэўнасці ў маіх сілах.

Вось гэтай радаснай для мяне весткай я спяшаю падзяліцца, тав. **Гікало**, з вамі.

Маё рашэнне абдуманае і цвёрдае, як заўсёды бывае цвёрдым слова комсамольца. Праз Вас, тав. Гікало, я абяцаю комуністычнай партыі і ўраду БССР, што ў будучым годзе ўсе мае каровы дадуць па 3000 літраў малака.

Я—круглая сірата. Не толькі бацькоў, але імя па бацьку і прозвішча свайго ўласнага я не маю. У 1913 годзе мяне бязіменную дзяўчынку двухтыднёвага ўзросту ўзяў да сябе з дзіцячага прытулку кулак Кунасаў Міхаіл. Ён даў мне сваё прозвішча і стаў маім „бацькам". За гэта я з дзяцінства была яго дармовай батрачкай. У 1930 годзе „бацьку"—кулака раскулачылі і выслалі, а я пайшла ў калгас і потым уступіла ў комсамол. Адсюль пачалося маё сапраўднае жыццё.

Цяпер я думаю, як-бы выкарыстаць кармы, каб атрымаць ад кароў найбольш малака. Клопатаў поўная галава, але 3000 літраў ад кожнай каровы я даб'юся.

Ксенія Міхайлаўна Кунасава.

ЖЫЦЬ СТАЛА ЛЕПШ

Першыя гады калгаснага жыцця Марыля працавала на палявых работах. Але ў мінулым годзе яе, як лепшую ўдарніцу паслалі на жывёлагадоўчую ферму цялятніцай.

Старанная работа па вырошчванню маладняка дала магчымасць Марылі стаць лепшай ударніцай жывёлагадоўлі. У мінулым годзе яна вырасціла 23 цялёнка. Сёлета Марыля **Максімовіч** на ферму перадала 43 сытых і здаровых цялёнка. Зараз яна пераведзена на арганізаваную ў калгасе свіна-ферму ў якасці свінаркі.

Ударная старанная работа забяспечыла былой батрачцы заможнае і культурнае жыццё. Марыля ў гэтым годзе са сваёй дачкой выпрацавала 660 працадзён, на якія акрамя грошай атрымае 2,9 тоны хлеба, 6,6 тон бульбы.

Акрамя гэтага яна са свайго прысядзібнага ўчастка сабрала значны ўраджай гародніны. Марыля мае зараз карову, свінню, трымае хатнюю птушку.

Жыве яна ў чыстай, цёплай і ўтульнай хаце і адчувае сябе маладой, бадзёрай.

Рабая Галя.

К-с „Шлях соцыялізма", Сенненскі раён.

За 250 цэнтнераў

Цяжка раней жылося Лазарчык Дуні. Яна бяднячка, удава. З малым дзіцём ёй прыходзілася хадзіць да кулакоў, зарабляць сабе на хлеб.

Кулакі прымушалі Дуню працаваць ад цямна да цямна. А плацілі вельмі мала. Дуня хадзіла ў падранай вопратцы, бо не хапала грошай на новую. Яна і яе дзіцё галадалі. Ніхто аб яе горы не думаў, ніхто не дапамагаў.

Часта над Дуняю здзекваліся кулакі і заможнікі. Яны казалі, што яна „гультайка", лянуецца працаваць, а таму ходзіць голая і галодная. Але ад кулакоў-эксплаататараў Дуня і не чакала нічога лепшага.

Калгасны лад змяніў жыццё батрачкі. Зараз Дуня працуе ў калгасе. Яна лепшая ўдарніца.

У час апрацоўкі ільну Дуня кожны дзень намінала і атропвала па 16 кілограм валакна.

Прачытаўшы ў раённай газеце зварот калгасніц калгаса „Ільіч", Менскага раёна, якія заклікаюць змагацца за 250 цэнтнераў бульбы з га, Дуня паставіла перад калгаснікамі задачу, дабіцца такога-ж ураджаю.

Ініцыятыву Дуні падтрымалі. Ужо адведзена зямля пад бульбу, адабрана насенне.

У дзень, калі прапрацоўвалі прамову тав. Сталіна на нарадзе стаханаўцаў, усе калгаснікі і калгасніцы шмат гаварылі пра работу Дуні. Такую вялікую ўвагу да сябе яна заваявала толькі сваёй добрасумленнай працай.

На сходзе тут-жа вынеслі пастанову прэміраваць Дуню 50 рублямі.

Тав. Сталін сказаў, што жанчына ў калгасе вялікая сіла. Гэта сіла робіць вялікія справы на соцыялістычных палях, гэта мы бачым і на прыкладах работы Лазарчык Дуні.

Дубіцкі.

Калгас імя Куйбышэва,
Смалявіцкі раён.

ЛЕПШАЯ ЎДАРНІЦА СВІНАГАДОЎЛІ

Свінагадоўчая ферма калгаса „Шлях да соцыялізма" з'яўляецца перадавой у раёне. На ферме ўзорна наладжана работа і падабраны добрыя кадры. Узяць тав. **Кіндарову** Дарку. На ферме яна працуе ужо больш двух год, да яе прымацаваны 7 свінаматак, у тым ліку 2 свінаматкі імпартныя англійскай пароды.

Тав. Кіндарава да сваёй працы адносіцца добрасумленна. У 5 гадзін раніцы яна ўжо на ферме, корміць і мые сваіх свіней, прыбірае станкі, наводзіць на ферме належны парадак. Прымацаваныя да яе свінні добрай упітанасці, нармальна праходзіць апарос і добра даглядаецца маладняк. За 1935 год 7 свінаматак прынеслі 131 штуку прыплоду, што складае больш 18 парасят на кожную свінаматку. Маладняк увесь захован, 60 парасят прададзены па танных цэнах калгаснікам.

Тав. Кіндарава за 1935 год выпрацавала звыш 500 працадзён і ў гэтым годзе стала сапраўды заможнай, бо атрымае звыш 100 пудоў хлеба, каля 300 пудоў бульбы, гародніну, грошы і іншае.

Мудрыя словы тав. Сталіна ажыццяўляюцца на практыцы.

„Калгасны лад робіць жанчыну працоўную роўнай усяваму мужчыне працоўнаму".

Берына.

Крычаўскі раён.

Лепшая цялятніца калгаса „Прагрэс", Віцебскага раёна, Раманава Анна Міхайлаўна.

ЗВЯНО СТАХА

Мы хочам расказаць не толькі як працавалі па-стаханаўску, але і як зарадзіўся ў нашым звяне стаханаўскі рух.

З таго часу, як пачалі трапаць ільновалакно, прайшло больш 20 дзён. Увесь гэты час наша звяно працавала па-старому. Калгасніцы не мелі поўнай загрузкі рабочага дня.

Дні ішлі ў некарысных разваганнях. Натропвалі па 4—5 кгр. На працу прыходзілі позна і рана зварочваліся дамоў, мала працавалі, але гэта яшчэ больш стамляла нас.

Мы чулі пра стаханаўскі рух. Іскра гэтага руху загарэлася і ў нашых сэрцах. Спазненне нашага калгаса ў здачы дзяржаве ільновалакна пачало вельмі хваляваць нас.

З кожным днём прозвішчы—Стаханаў, Бусыгін і трапальшчыц—Быкоўскай, Рагоўскай і Перцовай усё больш былі чутны ў калгасе. Праз некалькі дзён стаханаўскія метады работы сталі здабыткам шырокіх мас калгасніц. Між знатных людзей былі ўжо прозвішчы калгасніц нашага сельсовета, нават і нашага калгаса, як Серабраковай, Салаўёвай Варвары, Дзяжурнай Анны, якія ламалі старыя нормы выпрацоўкі.

У пачатку справа стаханаўскага руху ў сельсовеце ішла самацёкам. Не з усімі калгасніцамі было распрацавана гэта пытанне. На злёт, які склікаўся пры сельсовеце, былі запрошаны асобныя калгасніцы. І пасля гэтага самі калгасніцы патрабавалі склікання агульнага схода, дзе слухалі прамову нашага любімага Сталіна і дэталёва азнаёміліся з метадамі працы Марыі Рагоўскай і Сцепаніды Быкоўскай, якія першыя ўзнялі ў БССР сцяг спаборніцтва па якасці і колькасці трапання ільну. Мы даведаліся, што іх заклік падхоплен Пярцовай, Кавалёвай і другімі.

Не засталіся ў баку і нашы калгасніцы—Салаўёва Варвара, Дзяжурная Анна, Серабракова Фіма, Вараб'ёва Матрона, якія выпрацоўвалі ў той час звыш 20 кгр. Радасна было слухаць аб гэтых дасягненнях і разам з тым сорамна, што мы ўсё яшчэ стаялі ў баку ад гэтай вялікай справы. Нам хацелася хутчэй пайсці са схода і пачаць працаваць не так, як працавалі мы да гэтага часу.

На другі дзень, ледзь пачынала світаць, а мы ўжо былі на нагах. Нас ахапляла думка, хто сёння першым прыдзе на ёўню. Нібы згаварыўшыся, усе прышлі амаль разам. Толькі наш шасцідзесяцігадовы старычок—Церах скончыў ужо сушку ільна і набіваў ужо другую ёўню.

У гэты дзень, як ніколі, спорылася работа. Таму што мяльшчыкі Смірноў Пётр, Шургаеў Барыс добра мялі трасту. Не малое старанне прыкладзена і падавальшчыцамі Бальшаковай Зінай і Радзінковай Наталляй, якія ў час падачы раўнавалі жмені і злёгку вытрасалі кастрыцу. Работа падсобнага звяна давала магчымасць падвойваць і патройваць норму. Шасцідзесяцігадовая калгасніца **Шугаева** Сце-

Дзяжурная Марына.

Толькі калгаснае
біць працу справа
яно магло пара
гераінь жанчын
калгаснае жыццё
няроўнасць і пас
на ногі". *(З выступл*
прыёме калгасніц-удар
кіраўнікамі партыі і ўр

ХАНАВАК

паніда Міхайлаўна натрапала 25 кгр. З усіх астатніх звенняў падвозілася сушаная траста. Штодзённа нормы намі перавыконваліся. Наша звяно заваявала права быць стаханаўскім. Весела і радасна было працаваць.

Паміж намі ў звяне разгарэлася соцыялістычнае спаборніцтва. Маладая калгасніца Дзяжурная Марына штодзённа абганяла нас. Яна выпрацоўвала па 30—43—50 і нарэшце 66,6 кгр. Яе спрытныя рукі і багаты вопыт, набыты па тропцы ільну ў кулакоў, не мог не прыкаваць нашай увагі да сябе.

Гледзячы на яе, мы заўважалі роўнамернае, спакойнае мільганне доўгага шаўкавістага ільну. Здавалася на яго шаўкавістасці не можа затрымацца ніводная кастрыца. Яна мала ўдарае па жмені сваёй невялікай кляновай, добра адшліфаванай трапалкай.

Прышоўшы дамоў Марына не адчувала стомленасці. Муж, дзеці віталі яе з перамогай. Здавалася, маленькая шасцімесячная Верачка скакала на руках ад таго, што яе маці стаханаўка. Ды і сапраўды, гэты дзень, дзень перамогі нашага звяна быў самым шчаслівым днём нашага жыцця.

— І нічога дзіўнага мы не зрабілі,— гаворыць Марына. Толькі тое, што наш рабочы дзень быў поўнасцю загружан. Давалася добра прасушаная траста і шмат дапамагала работа падавальшчыц. Зараз мая работа добра ацэнена. Я выпрацавала за дзень больш 50 працадзён і за маю працу сельсовет прэміраваў мяне 100 руб., а праўленне калгаса абяцае ў хуткім часе перавезці маю хату з хутара ў цэнтр калгаса.

Дрэнна толькі тое, што ў нашым калгасе не працуюць дзіцячыя яслі. Майму мужу прыходзіцца заставацца даглядаць дзяцей і не хадзіць на работу.

Добрая работа дзіцячых ясляў і аслабаненне трапальшчыц ад некваліфікаванай работы, у будучым годзе, яшчэ больш забяспечыць высокую норму выпрацоўкі ільну.

Бальшакова Прося, Шугаева Сцепаніда, Шугаева Малання, Дзяжурная Марына.

Віцебскі раён. Калгас імя Молатава.

Серабракова Фіма.



Дзяжурная Анна.

Звяно Дзяжурнай правярае якасць натропанага ільновалакна.

Усесаюзны рэйд

праверкі выканання статута с.-г. арцелі

ПА КАЛГАСАХ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Праводзячы рэйд праверкі выканання 14-га пункта статута, мы імкнуліся ахапіць, як мага больш аб'ектаў і выявіць сапраўднае становішча на месцах. Для гэтай справы масавы аддзел горсовета, разам з Ахматмладам прыцягнуў групу актывістак і членаў горсовета і накіраваў у сельсоветы і калгасы. Праверка праходзіла ў 11 сельсоветах. Вылучаныя таварышы для праверкі прыцягнулі і калгасны і сельсоветскі актыў. Вось, што выяўлена ў ходзе праверкі.

У калгасах „Зорка", імя Леніна, „Прызыў", „Асінаўка", Бараўлянскага сельсовета, у галіне выканання 14-га пункта, справа абстаіць добра. Калгасніцы своечасова атрымліваюць водпуск. Вось **Крыцкая** Еўдакія і Ольга з калгаса „Зорка" на сёмым месяцы цяжарнасці былі пераведзены на больш лёгкую работу. Ім за адпачынак налічылі працадні згодна статута. Двухмесячны адпачынак атрымалі і калгасніцы **Іванова** Марыя, **Хлюсічэва** Пелагея, **Ціхнова** Ульяна, **Казлова** Анна з калгасу „Прызыў", ім правільна налічылі працадні.

Яслі ў сельсавеце працавалі да 1-га кастрычніка. Зараз пабудавана хата-радзільня, якая хутка адчыняецца.

Сур'ёзна падыходзяць да выканання 14-га пункта статута і ў калгасах „Серп і молат", Вална", імя Кірава, „Новы шлях" і „Чырвоны Окцябр", Нікалаеўскага сельсовета. Значная колькасць цяжарных калгасніц пераводзіцца на больш лёгкую работу. Усе цяжарныя атрымліваюць своечасова адпачынак. Цяжарным жанчынам своечасова прадастаўляецца транспарт для паездкі ў кансультацыю, ці бальніцу. Добра пастаўлена і медычная дапамога.

У праверaных Елагінскім, Бабініцкім, Старасельскім сельсоветах таксама не знойдзены скажэнні ў выкананні статута. У Бабініцкім сельсавеце ў канцы снежня адчыняецца на 10 ложак хата-радзільня.

Нельга не адзначыць яслі калгаса „1 мая", Старасельскага сельсовета. Яны яшчэ і зараз працуюць і абслугоўваюць дзяцей ясельнага і дашкольнага ўзросту. Яслі па праву лічацца лепшымі ў раёне. Добра абсталёвана памяшканне з чатырох пакояў. Маюцца розныя цацкі. Добра адносіцца да працы ўвесь абслугоўваючы персанал. Недарма загадчыца ясляў тав. **Паўлоўская** атрымала ад Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР прэмію.

Аднак, далёка не ўсюды такое становішча. Недапушчальнае ігнараванне сталінскага статута выяўлена рэйдам па Селіцкаму і Міхалеўскаму сельсавету. Калгасніца з калгасу імя Калініна **Разумоўская Надзея** працавала да самых радоў і адпачынкам не карысталася. **Разумоўская Ольга** працавала да 16-га лістапада, а 25 лістапада нарадзіла. **Разумоўская Елізавета** і зараз не атрымлівае адпачынку, а ёй ужо адпачынак належыць атрымаць. Ніводнай з названых калгасніц працадні за адпачынак не налічаны.

Не лепш і ў калгасах „МОПР", імя Сталіна і імя Маркса. Калгасніцы **Клачкова** Варвара, **Рахунава** Александра, і **Разумоўская** Агаф'я да самых радоў не мелі адпачынку.

Па ўсіх вышэйназваных калгасах поўнасцю адсутнічае вучот цяжарных жанчын і дрэнна пастаўлена радзільная дапамога. Праўленні гэтых калгасаў нічога не робяць, каб забяспечыць адчыненне ў калгасах ясель і дзіцячых садоў. Да рожаніц тут адносяцца нячула. Калгасніца Разумоўская Агаф'я (калгас імя Карла Маркса) праз тры тыдні пасля радоў вышла на работу і ўзяла з сабой у поле дзіця. Нават мацярам, якія кормяць дзяцей малаком і ў якіх няма кароў, малака калгас не адпускае.

У калгасе „Новы свет", Міхалеўскага сельсавета, калгасніцы **Адамцовай** не налічваюць працадзён, спасылаючыся на тое, што яна мала выпрацавала працадзён. Па гэтых-жа прычынах у калгасе „Шлях соцыялізма" не налічваюць працадзён калгасніцам **Сурганавай, Еўдакімавай і Зайцавай.**

Яўна бяздушныя адносіны да рожаніц маюць месца і ў калгасе „Клім Варашылаў". У рожаніцы **Бараўцовай** Ольгі пасля радоў пачалося кровацячэнне. Двойчы муж Бараўцовай ездзіў за фельдчарам Шаірко ў вёску Івашкава. Кожны раз Шаірка абяцаў прыехаць. Але на працягу двух тыдняў ён да хворай не прыязджаў. Старшыня калгаса нічым не дапамог Бараўцовай у аказанні медычнай дапамогі. Нават да гэтага часу ёй яшчэ не налічаны працадні па цяжарнасці.

Заслугоўвае ўвагі і такі агідны факт: у яслях калгаса „Іскра Леніна", Шумянскага сельсавета, 27 лістапада ў дзесяць гадзін вечара брыгада знайшла чатырохгадовага хлопчыка, якога замкнулі аднаго ў памяшканні. У пацёмках ён адзін ляжаў на печы. Наогул у гэтых яслях выяўлена недапушчальнае становішча. У памяшканні брудна, холадна, выбіты шыбы. Загадчыца ясляў **Петрачэнка** злачынна адносіцца да выканання сваіх абавязкаў. Старшыня калгаса не дапамагае яслям у рабоце, нават дроў да гэтага часу ў яслях няма.

Рэйд праверкі, які зараз праводзіцца, дапаможа знішчыць усе недахопы і скажэнні ў выкананні сталінскага статута сельгасарцелі.

Віцебск. **Астроўскі.**

НАШЫ ЗЕЦІ

Міша Раготнер сядзеў за сталом і слухаў радыё, калі прынеслі пошту. На яго імя было атрымана пісьмо з замежнай маркай, хлопчык прагна схапіў яго, ускрыў канверт і паглыбіўся ў чытанне. Пісаў яго стары таварыш.

Дарагі Міша!

Калі я чытаў тваё пісьмо, я радаваўся таму, што ты жывеш у такой прыгожай краіне, дзе дзеці з'яўляюцца „гаспадарамі зямлі", як спяваеце вы ў песні. Ты пішаш, што ў Менску для дзяцей будуюць палац піянераў, што лепшыя людзі Беларусі займаюцца гэтай справай, што ўрад хоча зрабіць гэты палац лепшым ва ўсім свеце. Ты пішаш, што дзесяць класаў вашай школы спаборнічаюць за пераходны сцяг, што шосты „Б"—лепшы клас і што ты любіш сваю школу. У вашай краіне любяць дзяцей і настаўнікі дапамагаюць ім вучыцца. У вас школа дае падручнікі і танныя абеды.

Міша, усё што ты пішаш, усё гэта як казка! А ў нас не так. Ты напэўна помніш нашу абшурпаную школу. У ёй цяпер значна горш, чым было пры табе, два гады таму назад. У нас па-ранейшаму цяжка вучыцца і настаўнік б'е вучняў за дрэнна вывучаныя ўрокі, за тое што—хто-небудзь голасна засмяецца, альбо пагарэзнічае ў час перапынку. У вас вучацца ўсе, а ў нас дзеці рабочых не могуць наведваць школы таму, што плата за вучэнне вялікая, а рабочы зарабляе дужа мала. Нават на жыццё не хапае. Аб дзецях беспрацоўных я і пісаць табе не буду. Страшна нават глядзець на іх.

Міша, калі я крышку падрасту, я абавязкова паеду ў вашу краіну. Я хачу быць, як і ты, піянерам, хачу насіць чырвоны гальштук, вучыцца ў вашай цудоўнай школе, хачу наведваць вашыя дзіцячыя дамы адпачынку і гуляць у палацы піянераў.

Пішы Міша, часцей пішы, твае пісьмы, як цудоўная казка.

Твой Янэк.

Міша прачытаў пісьмо і задумаўся. Усяго толькі два гады таму назад ён прыехаў да бацькоў у Менск, а да гэтага часу жыў у бабушкі ў Польшчы. Ён дужа добра разумеў, чаму так моцна хочацца Янэку прыехаць у краіну Советаў. Вясёлае, радаснае жыццё ў нашых дзяцей. Клопатамі і любоўю абкружаны яны, перад імі шырока адчынены дзверы ў незвычайнае, светлае жыццё.

Па ініцыятыве тав. **Гікало** ў Менску будуецца палац піянераў.

Некаторыя казалі:—дзе будаваць? У цэнтры—няма месца, а на ўскраіне, які-ж гэта палац?

Але месца знайшлося! ЦК Комуністычнай партыі Беларусі вынесла рашэнне, каб будынак, які будуецца для клуба будаўнікоў быў пераданы для палаца піянераў. І вось, амаль у самым цэнтры, на вуліцы Энгельса, закіпела небывалае будаўніцтва. Людзі з энтузіязмам працуюць, узнімаючы веліч палацу.

Вельмі часта будаўніцтва наведвае тав. **Гікало.** У першае-ж сваё наведванне, абышоўшы увесь будынак, ён сказаў:—перарабіць трэба ўсё. Прынцып павінен быць такі—больш прастору!

Створаны совет садзейнасці пабудове палацу піянераў энергічна узяўся за справу. Усе лепшыя, тэхнічныя сілы рэспублікі прыцягнуты да гэтага будаўніцтва, усе лепшыя дзеячы мастацтва працуюць над афармленнем гэтага прыгожага будынку. Інжынеры, архітэктары, мастакі, пісьменнікі, педагогі, педолагі—усе яны з любоўю і адданасцю працуюць над ажыццяўленнем радаснай казкі.

Тысячы дзяцей з нецярплівасцю чакаюць, калі адчыняцца дзверы цудоўнага палаца. Усё, аб чым толькі могуць марыць дзеці, развіваючы сваю творчую фантазію, усё прадугледжана ў праекце бліскаючага святлом, спяваючага радаснага будынка. Гэта будзе сімфонія ліній, святла, фарбаў.

У нашай школе дзеці ў цэнтры ўвагі не толькі педагогаў, НКасветы, але і партыйнай арганізацыі і ўсёй совецкай грамадскасці.

У чацвертай узорнай школе імя Кірава рэбята і зараз любяць успамінаць, як яны разам з тав. **Валковічам** у лесе разводзілі касцёр. Ярка блішчаць іх вочкі, калі яны расказваюць:

— Мы напісалі пісьмо тав. Валковічу і запрасілі яго да кастра. А калі ён прыехаў, мы хацелі вітаць яго і сказаць прамову, а ён гаворыць:—гэта сумна, давайце лепш з песен пачнем. І зацягнуў „Конную Будзённага". Мы ўсе адразу падхапілі. І праўда, адразу стала весела. Потым ля кастра тав. Валковіч расказаў нам, як ён на франтах змагаўся за совецкую ўладу.

Успамінаючы расказы свайго госця аб грамадзянскай вайне рэбята захапляюцца. Яны, хочуць быць героямі, змагацца за яркае светлае жыццё ўсіх працоўных.

Школа на днях падводзіць вынікі паспяховасці. Праз некалькі дзён, упершыню ў гэтым годзе, лепшаму класу будзе прысуджан пераходны сцяг. Усе дзяныя гавораць за тое, што ён дастанецца ўзорнаму класу—шостаму „Б".

— У нас ніводнага спазнення,—кажа класны арганізатар і лепшы вучань Якаў **Цафрын.** Па паспяховасці і дысцыпліне ідзем добра. У грамадскай рабоце таксама не адстаем. Наталля Міхайлаўна, гэта наш класны кіраўнік, дужа задаволена намі. І мы ўсе яе любім, яна дапамагае нам у вучобе, растлумачвае, дае парады. Усе вучні класа—піянеры.—Цафрын аб сабе не гаворыць, а хваліць таварышоў. Між тым, сам ён надзвычай добра вучыцца, іграе на мандаліне і ўдзельнічае ў грамадскай рабоце.

— Цафрын, Галкін і Чапко—гэта выдатнікі класа, рэбята ганарацца імі. Педагогі добра кваліфікаваныя і адданы сваёй справе.

А. Алмацінская.

Менск.

ТОКАР ГОМЕЛЬСКАЯ

Звычайнае трафарэтнае пытанне задаюць людзі пры сустрэчы адзін з другім:

— Як жывеце?

Сем год назад, шаснаццацігадовая Эмілія **Гомельская** на гэта запытанне нязменна адказвала:

— Дрэнна, не клеіцца. І рукі нейкія пустыя, і не ведаю да якога берага прыбіцца. Хатняя работніца я, самі ведаеце, на гэтай рабоце далёка не паедзеш.

Адказвала так Эмілія Гомельская зусім не таму, што адчувала ўпадак сіл, альбо не верыла ў свае сілы. Нічога падобнага. Ёй проста хутчэй хацелася заняць сваё сапраўднае месца ў жыцці, прабіць сабе дарогу да карыснай працы. Не ўпадак, а лішак сіл адчувала яна ў сабе.

Эмілія толькі што прыехала з вёскі. Жылося ёй дома не соладка. І голадна і холадна было. Асабліва нацярпеўся бацька за ўсё сваё доўгае жыццё... Гэты бедняк, паляк па нацыянальнасці, не меўшы ні кала, ні двара знімаў шапку перад польскімі шляхцічамі, каб яны прынялі яго на работу як „свайго". Але гэтага бязроднага і бяздомнага селяніна яны, зразумела, сваім не лічылі. У выглядзе ласкі адрэжуць яму на адзін год кавалак зямлі на поўдзесяціны, а потым зноў яе забіраюць.

Затое, калі ў вёсцы Беляны, Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета толькі пачулі пра калектывізацыю, гэты пасівелы селянін пачаў абыходзіць дамы беднякоў і заклікаць іх у калектыў.

Шаснаццацігадовая дзяўчына трапіла ў вялікі горад, у сталіцу рэспублікі. Першае што ўбачыла яна—гэта высокія каменныя карпусы завода. За велізарнымі вокнамі чуцен быў перастук станкоў. Тады падышоўшы да вартавой будкі, Эма палахліва запытала ў паставога міліцыянера:

— Ці працуюць дзяўчаты на гэтым заводзе?

— Працуюць, а як-жа—адказаў дабрадушна міліцыянер.

— А вы не ведаеце, мяне прымуць?..

— Вось гэтага табе не скажу, я не дырэктар. Падыйдзі вось сюды, у кантору, там і запытаеш.

Міліцыянеру пазванілі па тэлефону, ён узяўся за трубку, а Эма сама не адважвалася зайсці. Пастаяўшы хвіліну яна пайшла, але думка аб рабоце ў гэтых карпусах праследвала яе неспынна.

Што-ж рабіць дзяўчыне? З дапамогаю адзінай знаёмай яна ўстроілася хатняй работніцай. У жыцці Эмы—гэта выкрэсленыя старонкі. Яна прыехала ў горад, каб вучыцца, а для вучобы часу не заставалася. Яна ірвалася ў горад, каб сваім рукам даць якую-небудзь кваліфікацыю, а даводзілася абслугоўваць чужых людзей.

У рэдкія часы адпачынку Эма хадзіла на ўскраіну, дзе стаялі карпусы завода і ёй яшчэ мацней хацелася трапіць туды на работу.

І вось, нарэшце, Эма прышла на завод.

Калі чалавек ідзе спякотным полем і марыць аб халоднай вільгаці, штохвілінна выціраючы рукой засмаглыя губы, усе думкі яго міжвольна накіраваны ў адным напрамку, як-бы хутчэй дабрацца да вады. А калі ён ужо нарэшце, дабярэцца да вады, дык, не адыйдзе ад крыніцы пакуль не нап'ецца дасыта.

Тое-ж самае было і з Эміліяй. Марачы аб карыснай фізічнай працы, аб кваліфікацыі яна, нарэшце, трапіла да станка і прагна пачала ўнікаць у дэталі такарнага майстэрства. Токарам вырашыла яна стаць і не абы якім токарам, а такім, каб сам станок радаваўся яе рукам.

Гомельская Эмілія.

* * *

Прайшло некалькі год. Мы застаем Эмілію Гомельскую на машына-будаўнічым заводзе імя Кірава, на тым самым заводзе, аб якім яна ўвесь час марыла.

— У нашай краіне, а гэтым і ўслаўлена яна, гэтым і шчаслівая наша моладзь, гэтым і ўдзячна яна партыі і найвялікшаму правадыру народаў тав. Сталіну—зусім не цяжка атрымаць кваліфікацыю і дужа лёгка заняць сваё сапраўднае месца ў жыцці,—часта любіць паўтараць Эма.

Рабочыя і майстры завода з вялікай любоўю і павагай адносяцца да яе, называюць Эму проста—„наша крошка".

І праўдзіва, Эма невялікага росту, такарны станок ледзь не да самых плеч ёй. Але гэта не важна. Эма ставіць каля станка падмосткі і тады—спрабуй, дацягніся да яе!

Блакітныя вочы Эмы свецяцца радасцю і задавальненнем, яны іскрацца дабрадушшам і шчасцем. Чалавек дасягнуў мэты—хіба гэта малая радасць!

Зараз тры гадзіны дня. Змена праз гадзіну, але Эма і Аляксей (яе муж, яны працуюць у адным цэху) ужо на заводзе. Эма ветліва адказвае на прывітанні сяброў.

— Крошцы прывітанне!

— Стаханаўцу таксама. Як план?

Замаслены токар ахвотна адказвае:

— Сто процантаў было яшчэ да абеда, а зараз другую сотню наганяю.

— Ты ў мяне малайчына! Але я цябе ўсё-ж такі абганю.

— Абгоніш? Паглядзім,—і яны абое смяюцца.

Эме весела. Вовачка—шасцігадовы сынок добра паправіўся за лета. Сёння яна яму пакінула новую казку, узятую ўчора ў заводскай бібліятэцы. Малыш прымайстраваўся за сталом і, разглядваючы малюнкі, пачаў гадаць, што напісана ў кнізе.

— Мама, а ты калі была маленькай, таксама не ўмела чытаць?

— Не ўмела, дзетка.

— І папа не ўмеў?

— І папа не умеў,—адказвае маці, цалуючы сына.

Да пачатку змены яшчэ цэлая гадзіна, але ў Эмы шмат спраў. Трэба навастрыць і падрыхтаваць рэзцы. Некаторыя гэта робяць пасля гудка, а яна наўмысля прыходзіць раней, каб потым у час работы не было клапот і лішняй затраты часу. Потым трэба перагледзець дэталі, параіцца з майстрам наконт адной прапановы, якая нечакана ўзнікла ў яе. А стрэлка на гадзінніку паўзе і паўзе. Хаця ёй павінны здаць станок у спраўнасці, на поўным ходу, за поўгадзіны да змены, яна ўжо стаіць каля свайго станка і правярае—ці не капрызнічае ён, ці не захварэў чым-небудзь?

Ёй не церпіцца і яна дапамагае рабочаму, якога змяняе. Яна бярэ ў рукі трапкі, клапатліва аглядае станок, палівае станіну густым маслам і націрае паверхню станка да бляску, прыгаварваючы:

— Блішчы, кармілец мой, зіяй каханы мой!

Гэтыя дэталі характэрызуюць адносіны Гомельскай да работы, яе адданасць заводу. Вось чаму так спорыцца работа ў гэтай маленькай жанчыны з блакітнымі вачамі.

Эма вытачвае муфты да станкоў. Норма—34 муфты ў дзень. Гэта мізэрная норма для стаханаўкі, у якой станок не ведае ні секунды прастою, у якой загадзя прадуман план работы, рэзец навастран, дэталі пад рукою. Вытачыла адну, а другая ужо чакае сваёй чаргі. Яна ўжо вывучыла свой рэзец і на вока можа вызначыць, калі ён выцягнуць жалеза да патрэбнай нормы.

34 дэталі ў змену! Гэта мізэрная норма для стаханаўкі і Эма ледзь не ў тры разы перавыконвае яе. 250 проц. дае яна амаль заўсёды, а муж яе Аляксей ледзь дацягваў да 100 проц. І ён не адзін такі на заводзе. А ўсё гэта таму, што няма аганька, няма хвалявання за кожную дарэмна патрачаную секунду. Гомельская зарабляе амаль удвая больш такароў яе разраду—мужчын і жанчын. І не дарма яна кажа аб сваім станку—кармілец мой! Ён добра корміць яе. Ад радаснай працы—радаснае жыццё.

Эма шмат чытае. Яна часты наведвальнік кіно і тэатраў. Яна не адказвае сабе ў лішнім плацці. Вось толькі з кватэрай дрэнна. І ў гэтым ужо вінават заўком Кіраўскага завода. Абяцаць абяцае, а на справе дапамагчы ніяк не збярэцца. Але Эма не сумуе—будзе кватэра. Стаханаўцам-жа ў першую чаргу, а яна стаханаўка.

Бацька, маці, сёстры, сябры—хто ў пісьмах, а хто пры сустрэчах і зараз задаюць Эме звычайнае запытанне:

— Як жывеш?

І Эма адказвае на гэта цяпер па другому:

— Добра жыву, радасна жыву!

Е. Садоўскі.

Менск.

ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

З шасцю малымі дзецьмі засталася я ўдавой. Гэта было ў 1920 годзе. Жыць было цяжка. Усё-ж дзякуючы совецкай уладзе я вырасціла ўсіх сваіх дзяцей.

Цяпер я ганаруся імі.

Сын Вячэслаў ужо трэці год у школе лётчыкаў. Другі сын Аркадзій вучыцца ў Менскім фізкультурным тэхнікуме. Трэці—Леанід ў Віцебску вучыцца ў ФЗУ. Чацверты—Герман працуе на заводзе слесарам. Працуе слесарам і дачка Марыя. Дзеці мае, як і я, дачакаліся радаснага, шчаслівага жыцця.

Вельмі падабаецца мне тое, што кіраўнікі завода, дырэктар тав. **Сланімскі,** сакратар парткома **Зарэцкі** і старшыня заўкома **Безлюдаў** заўсёды цікавяцца жыццём рабочых. Яны часта бываюць на кватэрах рабочых. Часта прыходзяць і да мяне старой пытаюцца—ў чым адчуваю патрэбу і дапамагаюць, калі гэта трэба.

Перад Кастрычніцкімі святамі былі вызначаны тры прэміі за лепшае ўтрыманне кватэры і за лепшую падрыхтоўку да свят. Як радасна мне, што ў лік прэміраваных трапіла і я хатняя гаспадыня.

У нас і хатнія гаспадыні дапамагаюць у рабоце завода. Я яшчэ лепш пастараюся даглядаць сваіх дзяцей, каб яны маглі працаваць па-стаханаўску.

— Мне ўжо 60 гадоў, а яшчэ хочацца жыць і жыць. Бо жыццё ў нас з кожным днём становіцца прыгажэйшым.

Мацылевіч Еўдакія

Орша, завод „Красный Октябрь".

КАЛІ ВЕСЕЛА ЖЫВЕЦЦА, РАБОТА СПОРЫЦЦА

Гудок абвясціў аб сканчэнні абедзенага перапынку. Сёння, як і заўсёды Ефрасіння Фёдараўна **Жукоўская** яшчэ за некалькі мінут да гудка была ўжо ля свайго рабочага месца. Павольна, не нервуючыся ўзялася за працу. З надзвычайнай хуткасцю з-пад яе рук выходзілі ўсё новыя і новыя, акуратна запакаваныя пачкі цвікоў.

На твары Ефрасінні Фёдараўны ззяла шчаслівая ўхмылка. Хто ведае, чым выклікана гэта ўхмылка? Можа быць яе радуе груда запакаваных цвікоў, якая сёння, як і за ўвесь апошні час прывядзе яе на заводскую чырвоную дошку. А можа адчула яна салодкасць Любачкіных абдымкаў, якая зноў кінецца да маці, абдыме мілымі дзіцячымі ручкамі шыю і прашэпча:

— Мамачка, стаханаўка мая родная! Радасна ўхмыляцца ў Ефрасінні Фёдараўны падстаў многа.

Чатыры гады таму назад, калі памёр муж Ефрасінні Фёдараўны, яна думала, што цяпер ужо ні ёй, ні яе дзецям чалавечага жыцця не будзе. Засталося пяць дзяцей, а старшаму Уладзіміру ўсяго 15 гадоў. Гора сапраўды вялікае. Аднаго тады не ўлічыла тав. Жукоўская, што яе гора адбылося ў краіне Советаў, дзе дораг кожны чалавек, дзе аб удовах і сіротах асабліва клапацяцца комуністычная партыя і ўрад.

Хутка, вельмі хутка Ефрасіння Фёдараўна на сябе адчула гэтыя клопаты. Яе ўстроілі на працу на тым-жа заводзе, дзе працаваў муж. Дзеці ўсе вучыліся. У выхаванні іх дапамог фабком, дапамагла школа. Ефрасіння Фёдараўна цяпер добра зразумела, што прыходзіць у адчай не было чаго.

Прамову тав. **Сталіна** на Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў, тав. Жукоўская добра ведае. Яна ўважліва слухала кожнае слова прамовы пры распрацоўцы яе ў цэху і дома, калі яе зачытваў Еўгеній. „Жыць стала лепш, жыць стала весялей.“ Залатыя словы. Іх Ефрасіння Фёдараўна адчувае на сябе і на сваёй сям'і.

Жыць стала лепш ад таго, што аб хлебе, бульбе і іншых прадуктах не думае тав. Жукоўская. Іх хапае. Ёсць свой агарод, гадуецца парасёнак. Жыць стала весела таму, што хутка ў Ефрасінны Фёдараўны сын Владзімір скончыць Горацкую сельскагаспадарчую школу, а Еўгеній—у будучым годзе скончыць педагагічны тэхнікум. Жыць стала весела і таму, што дачкі—Верачка і Любачка — вучаніцы 5-га і 4-га класаў маюць шчаслівае дзяцінства. Яны добра вучацца, сыты, абутыя, катаюцца на лыжах і каньках.

А калі весела жывецца, дык работа спорыцца. І Ефрасіння Фёдараўна выконвае план на 180 — 190 проц. і зарабляе 7—8 рублёў у дзень.

... К канцу ўрачыстага пасяджэння партыйнай і профсаюзнай арганізацыі, прысвечанага XVIII гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі, зачытваўся загад аб прэміраванні стаханаўцаў завода. Калі сярод мноства прозвішч была названа Ефрасіння Фёдараўна Жукоўская, у клуб увайшоў яе сын Владзімір. Ён прыехаў на свята дамой і, ведаючы, што маці будзе ў клубе, пайшоў прама туды.

Радасная сустрэча адбылася паміж маткай і сынам. Моцна паціскаўшы ёй руку, Валодзя ўсхвалявана прагаварыў:

— Мамаша, я вамі ганаруся!

Шыфрына

Орша, завод „Чырвоны Окцябр“.

ЗА ЧЫСТАТУ

Шырока разгарнуўся конкурс на лепшую кватэру на фабрыцы «Дняпроўская мануфактура». Штодзённа самаправерачныя брыгады аглядаюць па 6—7 кватэр. І трэба сказаць, што конкурс даў добрыя вынікі. Лепшыя ўзоры барацьбы за чыстату паказала ткачыха **Порына Лея,** многасямейная жанчына.

У мінулым годзе ўжо прэміраваная за чыстату. Лея ўмела сумяшчае добрую работу на фабрыцы з чыстатой у кватэры. Яна лепшая стаханаўка - ткачыха.

Не горш Порынай працуе ткачыха **Дубсон Фейга.** Прэміравана яна больш 10 разоў, у тым ліку граматай ЦВК СССР. Кватэра Фейгі заўсёды чыстая. На ложках беласнежныя просціны, чыстыя вокны, стол, падлога, чыстая пасуда.

Не адстае ад іх і **Кумец Маня**— лепшая матальшчыца фабрыкі, якая таксама актыўна ўключылася ў конкурс.

Дуброўна. **Шарманава**

На першай Усебеларускай алімпіядзе масцкай самаадзейнасці промкааперацыі. Матрона **Бабкова** выконвае частушкі.

СТАХАНАЎКА ШОЎКУ

У канторы майстра цэха **Аблакова** стаяла высока трымаючы галаву:

— Тав. майстар, хачу працаваць самастойна,—голасна заявіла яна.

Майстар, абвёўшы яе вачыма, прагаварыў:

— А справішся?..

— Думаю, што спраўлюся.

Пацяклі дні кіпучай самастойнай работы. Вывучаючы рух машыны, Аблакова сустракала ўсё новыя „сакрэты", але з цягам часу колькасць „сакрэтаў" зменшылася.

Аблакова дабілася штодзённага выканання заданняў, але не давала яшчэ высокай якасці прадукцыі.

— Тады ў корпусе мала працавала жанчын на прадзільных машынах. Многія жанчыны адставалі ад мужчын па выкананні плана, хаця і працавалі на адной старонцы машыны. І вось Аблакова першай стала працаваць на двух старонках.

Не абышлося без насмешак.

— Падумаеш, узялася...

— Дзень-два папрацуе...

Не спалохалася гэтых кпінаў Аблакова, а яшчэ з большай сілай і большай заўзятасцю працавала на 2 старонках. Дзеннае заданне на 2 старонках Аблакова стала выконваць на 100—110 проц.

У корпусе не хапала прадзільшчыкаў. Прынялі рашэнне паставіць некалькі прадзільшчыкаў працаваць на 3 старонкі і адной з першых стала працаваць на трох старонках Аблакова.

Склікаюцца вытворчыя нарады. Рабочыя, работніцы корпуса вывучаюць, адкуль і чаму бярэцца брак. Некаторыя рабочыя ківалі на машыны: сла ое абсталяванне—прычына браку. Але хутка ўсе ўсведамляюць, што брак залежыць ад дрэннай якасці работы самаго прадзільшчыка.

Па корпусу разгарнулася барацьба за аўладанне тэхнікай прадзення, за культурны догляд і адносіны да машыны. Узнялі адказнасць рабочых не толькі за колькаснае, але і за якаснае выкананне плана. Разгарнулася індывідуальнае спаборніцтва. Аблакова спаборнічае з прадзільшчыцамі Дземідавай і Лесуновай.

Вырасла фабрыка, выраслі людзі яе. У чэрвені месяцы 1934 года Аблакову высунулі брыгадзірам жаночага агрэгата.

Прыходзіцца ужо клапаціцца не толькі за сваю машыну, але і за чоткую, бесперабойную работу 6 машын прадзільшчыц прымацаванай брыгады, — гаворыць Аблакова.

Работа ў брыгадзе Аблаковай ідзе чотка. Штодня праводзяцца пяцімінутныя нарады па падвядзенню вынікаў работы за мінулы дзень, выяўленню адстаючых Тут-жа крытыкуюць бракаробаў. арганізоўваюць практычную дапамогу.

Аблакова—стаханаўка. Выконвае штодня норму на 3-х старонках на 140—160 проц.

Брыгада штодзённа выконвае план і дабілася зніжэння браку да 0,3 проц. (замест дапускаемых 1 проц.) Услед за Аблаковай па выкананню плана ідуць работніцы — **Андрэйчыкава, Бараноўская, Мацюшэнка, Несцерава, Буга** і іншыя, якіх таксама, як і яе выхавала партыя Леніна—Сталіна.

Модлін.

Магілёў, шоўкавая фабрыка імя Куйбышэва.

МЕТАД КОМСАМОЛКІ КРЭСАВАЙ

Малодзенькай дзяўчынкай, з фабзавуча прышла на Добрушскі саломенна-цэлулозны завод **Крэсава** Марыля. Яе паслалі працаваць на выпарныя апараты малодшай выпаршчыцай шчолачаў, якія неабходны для варкі саломеннай сечкі ў катлах. Выпарка тады лічылася „вузкім месцам" завода. Яна не магла забяспечыць неабходнай колькасцю шчолачаў саломаварачны адцзел завода. У рэзультаце недахопу шчолачаў, варка саломеннай цэлулозы затрымлівалася. Завод знаходзіўся ў глыбокім прарыве.

Адміністрацыя завода, і начальнік Цыцэро сцвярджалі, што аддзел выпаркі шчолачаў пабудаван няправільна і патрабуе пераабсталявання. Пад гэтай шырмай хавалі свае нежаданне аўладаць тэхнікай, неўменне кіраваць па-новаму.

У гэты час старшы выпаршчык зволіўся з завода. Крэсава засталася адна ў аддзеле, механізаваным па апошняму слову тэхнікі. Яна пачала займацца ў гуртку тэхмінімума. Паспяхова засвоіла праграму гуртка і здала тэхэкзамен на „выдатна". На заводзе нехапала людзей. Крэсава працягвала працаваць адна на ўвесь аддзел. Партыя і ўлада даручылі ёй навейшае, імпартнае абсталяванне.

Паказчыкі прадукцыйнай работы тав. Крэсавай раслі. Яны былі значна вышэй паказальнікаў работы другіх змен. Але гэта не магло супакоіць імклівую натуру комсамолкі.

У той час, калі ўсе выпаршчыкі, пусціўшы шчолач з агульнага бака ў першы корпус выпаркі, поўнасцю пераганяюць яго потым у другі, трэці і чацверты корпус і толькі пасля гэтага пускаюць на плавільную печ, Крэсава працуе іншым спосабам. Пусціўшы шчолач з бака ў першы корпус, яна адначасова пускае яго ва ўсе астатнія карпусы і на печ.

Так Крэсава першая на заводзе і пакуль што адзіная прымяніла і карыстаецца метадам няспыннай работы ўсіх выпарных апаратаў у аддзеле, што ўнясло ў работу апошняга роўнамернасць. У выніку прымянення гэтага спосаба прадукцыйнасць працы крута ўзнялася.

Замест планавых 450 кубаградусаў шчолачаў шчыльнасцю ў 25 градусаў Бэмэ, тав. Крэсава пачала сістэматычна даваць 560 кубаградусаў шчыльнасцю ў 27—28 градусаў.

Працуючы метадам работы тав. Стаханава, Крэсава дала новы рэкорд выпаркі шчолачаў на Добрушскім саломенна-цэлулозным заводзе, які з'яўляецца адзіным у Саюзе па сваёй канструкцыі і метаду варкі саломеннай цэлулозы. Яна дабілася выпуску 588 кубаградусаў шчолачаў высокай якасці.

15 кастрычніка гэтая лічба была даведзена тав. Крэсавай да 735,9 кубаградусаў, што па яе думцы бязумоўна яшчэ не з'яўляецца прадзелам. **Я. Гуцаў.**

Папяровая ф-ка „Герой працы".

НАРОДНАМУ ПАЭТУ ОРДЭНАНОСНАЙ РЭСПУБЛІКІ

гарачае прывітанне

ад работніц і калгасніц Беларусі

Народны паэт

Шчаслівы і радасны народ Совецкай Беларусі святкуе трыцацігадовы юбілей творчай дзейнасці свайго народнага паэта **Янкі Купалы.**

Народны паэт соцыялістычнай рэспублікі. Як велічна і горда гучаць гэтыя словы на нашай цудоўнай радзіме. Як моцна адлюстроўваюць яны арганічную сувязь совецкага паэта са сваім народам. Як глыбока і ярка паказваюць яны тую велізарную павагу, любоў і клопаты, якімі акружае наша совецкая дзяржава і наш народ сваіх выдатных песняроў, майстроў мастацкага слова.

Так. Наш народ умее цаніць сваю літаратуру, умее цаніць яе творцаў. Соцыялізм, які стаў асновай нашага жыцця, які прасякнуў ва ўсе яго поры і дае ўжо свае цудоўныя плады, паставіў на велізарную вышыню работнікаў навукі, мастацтва, літаратуры— работнікаў культурнага ўчастка будаўніцтва новага жыцця. Соцыялізм раскрыў найшырэйшыя гарызонты перад „інжынерамі чалавечых душ", майстрамі літаратурнай справы, і зрабіў іх работу пачэснай і ўдзячнай, кранаючай самыя глыбокія пласты народу.

Народны паэт Совецкай Беларусі Янка Купала ў сваім выдатнейшым вершы „Госці" надзвычайна глыбока і вобразна паказаў гэта. Да яго, паэта, прышлі ў госці гаспадары абноўленай зямлі—новыя людзі новай соцыялістычнай краіны. Яны частуюць свайго паэта падарункамі—узорамі багатых пладоў калектыўнай працы. Яны дзеляцца з паэтам сваімі планамі далейшай работы і будаўніцтва. Яны разам з ім весяляцца і пускаюцца ў скокі. І паэт усхвалявана прызнаецца:

Такога гонару не меў ніколі,
Як на гэтае зямлі жыву.

Так. Нельга-ж было бачыць і перажываць усяго гэтага ў тыя часы, калі Янка Купала ўступіў на цяжкі шлях паэта, упітаўшага ў сябе ўсе пакуты тройчы прыгнечанага і прыдушанага працоўнага народу.

Смутак, вялікі смутак гучэў тады ў яго горкіх песнях. Слёзы разліваліся па іх радках. А скрозь смутак, скрозь слёзы прарываліся нутраныя гукі пратэсту супроць гнёту і эксплаатацыі, гукі гневу да прыгнятальнікаў і эксплаататараў.

Народ адчуваў у гэтых песнях самога сябе, свае думкі і чаканні і жывіў паэта сваімі сокамі. Творчасць Янкі Купалы гэтага перыяда—бурнага перыяда першай рускай рэволюцыі — зліваецца з народнай творчасцю.

І ў гэтым была сіла Янкі Купалы.

Ён страціў быў гэту сілу, калі, адарваўшыся на некаторы час ад народу, пайшоў за ілжывымі „сябрамі народу", якія прыкрывалі фальшыва-нацыянальным сцягам свае эксплаататарскія імкненні непадзельна рабаваць працоўны народ ці ўрваць хоць-бы некалькі большую долю, чым дагэтуль, у другіх эксплаататараў беларускіх працоўных мас рускіх, нямецкіх, польскіх—няважна якіх.

Але Янка Купала быў чужы ў гэтым лагеры. І ён зноў знайшоў сваю сілу, зноў стаў адчуваць свой народ, зноў зліўся з імі, калі ўбачыў абноўленую Беларусь, пераўтвараную, расцвітаючую Совецкую Беларусь, убачыў такой, якую зрабіла яе вялікая пролетарская рэволюцыя.

Паэт убачыў мудрасць кіраўніцтва партыі **Леніна—Сталіна,** убачыў сілу пролетарскага інтэрнацыяналізма, плады ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, рэзультаты братняй дапамогі Совецкага Саюза і ў першую чаргу рускага пролетарыята. Сын працоўнага народа, вышаўшы з глыбокіх яго пластоў, ён разам са сваім народам адчуў радасць новага жыцця. І ён заспяваў песні гэтага новага, соцыялістычнага жыцця.

Магутную сілу набыла зараз творчасць Янкі Купалы. Яго вершы эпохі соцыялізма захапляюць і запальваюць агнём энтузіязму, бо самі яны гараць гэтым агнём, бо вялікая сіла высокага мастацтва і высокай культуры закладзена ў іх.

Гэта сіла ідзе адтуль-жа, адкуль чэрпае яе ўся наша совецкая літаратура. Яна ідзе ад вялікай ідэі, створанай і ажыццяўляемай большэвіцкай партыяй і яе мудрымі велічнымі правадырамі **Леніным і Сталіным.**

У гэтым творчым росце Янкі Купалы ярка выражаецца агульны рост совецкай літаратуры народаў СССР і ў тым ліку рост яе сустаўной і неадрыўнай часткі—літаратуры совецкай Беларусі.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, на чале з таварышам **Н. Ф. Гікало** будзе і далей расці і развівацца, квітнець і ўзбагачацца совецкая літаратура БССР. І беларускі народ, народы ўсяго СССР з асаблівай радасцю будуць слухаць у гэтым цудоўным хоры гучнейшы голас свайго народнага паэта Янкі Купалы. Жыццерадасны і бадзёры, магутны і прыгожы голас.

(З перадавой „Звязды").

НАРОДНАМУ ПАЭТУ РЭСПУБЛІКІ ЯНКУ КУПАЛЕ

У дзень трыццацігоддзя Вашай літаратурнай дзейнасці Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі горача вітае Вас, як аднаго з выдатных паэтаў Совецкай Беларусі і Совецкага Саюза і майстра мастацкага слова.

ЦК КП(б)Б жадае Вам доўгага жыцця і новых велізарных поспехаў у Вашай далейшай мастацкай творчасці на карысць нашай соцыялістычнай радзімы, тварыць на радасць працоўных, якія будуюць пад кіраўніцтвам нашага любімага правадыра вялікага **Сталіна** сваё шчаслівае радаснае жыццё.

ЦК КП(б)Б.

МЕНСК

САЮЗ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ,

ЯНКУ КУПАЛЕ

Сардэчнае прывітанне нястомнаму паэту-рэволюцыянеру

Максім Горкі.

Бл 14/13

Янка Купала.

ЛЁН

Як на поле, на зямлю
Прышла раніца вясны.
Я пасеяла ў раллю
Жменю зёран ільняных.
Неба сеяла цяпло,
Цёплы дожджык цярушыў.
Ў думках радасна было,
Беглі песні ад душы.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як расці стаў, як падрос,
Як лісткі ўзняў да гары,—
Лён палола з ранніх рос
Да вячэрняе зары.
Сэрца ныла, бы з нуды,
Бы сама была не ўся,—
Спадабала я тады
Брыгадзіра Міхася.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як адцвіў ды як надзеў
Лён галоўкі на сябе,
Быў не горш, як у людзей,
Мела шчасце я ў сяўбе.
Рваць ішла яго ў снапы,
Пела песні аб вясне,
Брыгадзір лічыў капы,
Час-ад-часу моргаў мне.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як ішла лён абіваць,
Пад нагамі цёрся жвір,—
Нібы семя арфаваць,
За мной следам брыгадзір.
А мой пранік лясь ды лясь
Па гліняным, па таку.
Падышоў бліжэй Міхась,
Мне паклаў за стан руку.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

А як слала я лянок,
На зялёным, на лугу,
Дзе папаўся Міхасёк,
Цалавала на-бягу.
Сэрцу лёганька было,
Цэлы свет—вясёлы рай,
Хоць і восень, а святло
Так і льецца цераз край.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Змяла ў мяльніцы я лён,
Атрапала лён траплом,—
Засвяціў, як цудны сон,
Лён шаўковым валакном.
Промень ясны загуляў
Па страсе і па сцяне...
Хату новую стаўляў
Брыгадзір мой для мяне.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Янка Купала.

Цана асобнага нумара 20 кап.

Мацерам аб дзецях

Сустракаюцца, нажаль, яшчэ маласвядомыя бацькі, якія думаюць, што змагацца з дзіцячай непаслухмянасцю, з дзіцячымі, як яны кажуць, упартасцю і свавольнасцю трэба шляхам неспыннага адзёргвання, шляхам крыку, забароны, а часам і пакарання.

На другім годзе жыцця, дзіця звычайна нікому не дае спакою. За ўсім яно цягнецца, б'е, ламае, заўсёды чым-небудзь стукае, кідае на падлогу.

Але бацькі павінны памятаць, што гэта не гарэзнасць, не капрыз, што праз гэту дзейнасць дзіця развіваецца фізічна і разумова, праз яе яно прыагульваецца да жыцця дарослых і пазнае навакольны свет (даведваецца, што рэчы бываюць цяжкія і лёгкія, вялікія і малыя і т. д.). Вось чаму гэтую дзейнасць дзіцяці трэба падтрымліваць, а не спыняць.

„Нельга", „нельга", „не смей", „не чапай"—чуецца ў некаторых сем'ях з раніцы да вечара. Спачатку дзеці не звяртаюць увагі на гэтыя выкрыкі дарослых. Потым у адказ на пакаранні дзеці пачынаюць біцца, а падросшы і зразумеўшы, што дарослыя дужэй, адказваюць крыкам і плачам, які часамі пераходзіць у нервовы прыпадак.

Разам з гэтым дзіця робіцца ўпартым, злосным, нават варожа настроеным да бацькі і маці.

Такім чынам, ад неразумення таго, што гульня—не пустая забава для дзіцяці, не гарэзы, а сапраўдная патрэбнасць, бацькі затрымліваюць развіццё дзіцяці і псуюць яго характар.

Велізарнае значэнне мае правільная арганізацыя жыцця дзіцяці на кожны дзень.

Маці часта скардзіцца:—Ніякага зладу няма з дзіцём. Калі даю яму есці, яно адмаўляецца. Я яго ўгаварваю, загаварваю, паб'ю нават. Спаць кладзецца—цэлая бяда. Сядзі ды калыхай яго. І, наогул, дзіця капрызнае, свавольнае, усё на сваім хоча паставіць, а ледзь што—крычыць, б'ецца. Ужо і не ведаю, што рабіць з ім.

Такая маці не разумее, што ва ўсім вінавата яна сама. Памылка яе заключаецца ў тым, што яна адносіцца да дзіцяці, як да дарослага.

У дзіцячым узросце—у пэўныя гады—узмоцненыя ўгаворы і прымус у большасці выпадкаў прыводзяць да проста адваротных рэзультатаў.

Правільны падыход да выхавання дзіцяці заключаецца ў тым, што, напрыклад, пры адмове дзіцяці есці трэба ўбраць яду без усялякага шуму і нездаволення, нічога потым не даючы дзіцяці да наступнай яды. Так трэба паўтараць да таго часу, пакуль дзіця не будзе есці самастойна.

Гэтакім чынам трэба весці сябе і ў другіх выпадках.

Дзеці ўжо з самага ранняга ўзросту дужа добра разбіраюцца ў тым, як дзейнічаць на бацькоў, як дабіцца ад бацькоў свайго. Толькі цвёрдыя, але заўсёды роўныя і спакойныя адносіны да дзіцяці, забяспечваюць нармальнае выхаванне і нармальную абстаноўку ў сям'і.

Навука ўстанавіла, што чым маладзей дзіця, тым лягчэй прывіваць яму правільныя звычкі, тым лягчэй чаму-небудзь навучыць.

У грудным узросце лёгка, напрыклад, прывучыць дзіця да арганізаванага і своечасовага адпраўлення сваіх патрэб, а ўжо ў старэйшым ўзросце на гэта давядзецца патраціць шмат сіл і часу. Наогул прывучыць у час есці, у час спаць, апранацца і распранацца, арганізавана гуляць, прывучыць дзіця да самастойнасці можна без асаблівай цяжкасці яшчэ ў малодшым узросце.

Калі-ж дзіця прывыкне да таго, што есці яму даюць, калі толькі яно закрычыць, што спаць яно кладзецца, калі захоча, дык перавыхаваць яго, зрабіць у старэйшым узросце арганізаваным, вясёлым, спакойным, самастойным і здаровым дзіцём, будзе дужа цяжка.

Калі дзіця своечасова прывучана да рэгулярнага кармлення і задавальнення сваіх патрэб, калі яму даецца прастор да гульні і дзейнасці, калі адносіны да яго цвёрдыя, вытрыманыя і спакойныя, тады арганізм дзіцяці будзе працаваць добра і безадказна. Такое дзіця само ў час захоча спаць, гуляць, есці і не будзе браць ад бацькоў столькі сіл і часу для свайго выхавання.

В. Мамлееў.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1936 год

на двухтыднёвы журнал ЦК КП(б)Б

„Работніца і калгасніца Беларусі"

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 мес.—40 кап. | на 6 мес.—2 р. 40 кап.
на 3 мес.—1 р. 20 кап. | на год—4 р. 80 кап.

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях БССР і лістаносцаў

Выданне ЦК КП(б)Б РЭДКАЛЕГІЯ

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118

№ 501